Шыршоў І.Я., дацэнт

# КОМПЛЕКСНЫ ПАДЫХОД ДА МІЖНАРОДНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў ГАЛІНЕ КУЛЬТУРАЛОГІІ (узор праекта)

Прапануем канцэптуальна абгрунтаваны прыкладны праект устанаўлення эфектыўных кантактаў паміж Беларускім універсітэтам культуры і Патсдамскім універсітэтам. Апошні рыхтуе педагогаў, якія атрымліваюць рознабаковую культуралагічную, сацыялагічную і музычную адукацыю, авалодваюць сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі, замежнымі мовамі, у тым ліку славянскімі.

У час перамоў з Інстытутам філасофіі Патсдамскага універсітэта намечана правесці сумеснае даследаванне на тэму «Прырода і функцыі межаў паміж рэгіянальнымі і этнічнымі культурамі». Беларускі бок мог бы адначасова прыняць удзел у распрацоўцы агульнай тэорыі мяжы метадамі сістэмнага аналізу.

Такое даследаванне знойдзе свой лагічны працяг ва ўвядзенні на факультэтах Беларускага універсітэта культуры і Патсдамскага універсітэта спецкурсаў па вывучэнні этнарэгіянальнай стратыфікацыі культур Беларусі і Германіі, у абмене вопытам выкладання такіх новых дысцыплін, як філасофія культуры, культурная антрапалогія, этнапсіхалінгвістыка і інш.

Інстытут гісторыі Патсдамскага універсітэта зацікаўлены ў даследаванні сумежнай тэмы «Прафілактыка этнарэгіянальных і сацыяльных канфліктаў сродкамі культурнага дыялогу». Па выніках даследавання мяркуецца правядзенне міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай праблемам нацыянальнай канфліктологіі. Германіяй і Беларуссю назапашаны пазітыўны гістарычны вопыт у наладжванні талерантных адносін паміж суседнімі этнічнымі культурамі. Гэты вопыт дэтэрмінуе іх далейшае збліжэнне на шляху агульнанацыянальнай ідэнтыфікацыі краін. Вынікі даследаванняў можна было б увасобіць у такіх, напрыклад, спецкурсах, як «Канфліктологія», «Беларуская культура і культура нацыянальных меншасцей».

У Інстытуце сацыялогіі Патсдамскага універсітэта ўжо некалькі год распрацоўваецца метадалогія даследавання культуры вялікага горада і культуры сярэдняга горада. Адпаведна ў працэсе выкладання сацыялогіі культуры асаблівая ўвага надаецца тэарэтычнаму раскрыццю і эмпірычнай інтэрпрэтацыі сеткі такіх карэлятыўных катэгорый, як «культурная прастора», «культурны час», «культурная норма», «культурны сімвал» і інш.

Кафедра сацыялогіі і культуразнаўства Беларускага універсітэта культуры магла б надключыцца да гэтых даследаванняў, запланаваўшы тэму «Гарадская маладзежная культура прэфарматыўнага тыпу» («бацькі вучацца ў дзяцей»).

Інстытут гісторыі культуры Патсдамскага універсітэта прапанаваў Беларускаму універсітэту культуры цэлы комплекс навуковых і вучэбных праблем у рамках дагаворнай тэмы «Умовы творчай і сацыяльнай дынамікі класічных канцэпцый мастацкай культуры». На першым этапе даследавання вучоныя двух універсітэтаў маглі б аб'яднаць свае намаганні ў адзіным даследчым калектыве для рэтраспектыўнага вывучэння працэсаў развіцця беларускай і нямецкай літаратуры, драматургіі, жывапісу ў XIX і першай палове XX ст. Затым, пасля папаўнення новымі спецыялістамі, гэты творчы калектыў зможа пачаць распрацоўку педагагічных методык і псіхалагічных мадэлей нетрадыцыйнага, постмадэрнісцкага асваення разнастайных эталонаў мастацкай культуры інтэлектуальна развітымі групамі студэнцкай моладзі.

І, нарэшце, выкладчыкі і супрацоўнікі Інстытута музыкі праявілі зацікаўленасць ва ўстанаўленні навукова-педагагічных кантактаў з беларускімі калегамі на аснове абмену творчым вопытам у галіне выкладання тэорыі і гісторыі музыкі. Нямецкі бок прапанаваў распрацаваць сумесную шматпланавую праграму «Гістарычныя шляхі развіцця музычнай культуры ў Германіі і Беларусі», сканцэнтраваўшы пры гэтым увагу на адраджэнні амаль забытых узораў песеннай і інструментальнай творчасці XVIII - XIX стст., якія належаць да разраду так званага «музычнага быту» (шляхецкага, бюргерскага і да т.п.).

Інстытут вылічальнай апрацоўкі статыстычнай, эканамічнай і сацыяльнай інфармацыі Патсдамскага універсітэта прапануе беларускім калегам правесці сумеснае даследаванне па навукова-прыкладной тэме «Удасканаленне фармалізаваных сістэм перакладу тэкстаў на замежныя мовы». Адначасова могуць быць вызначаны і іншыя формы супрацоўніцтва ў галіне дэскрыптыўнай лінгвістыкі і інфарматыкі.

Такім чынам, гаворка ідзе аб устанаўленні цесных навуковых і педагагічных сувязей паміж Беларускім універсітэтам культуры і Патсдамскім універсітэтам у рамках адзінай сістэмы «навука - адукацыя» шляхам распрацоўкі і рэалізацыі комплекснай мэтавай праграмы. Да названай праграмы маглі б далучыцца і іншыя гуманітарныя ВНУ, у тым ліку і недзяржаўныя. Гэта праграма можа складацца з адносна самастойных, але тэматычна сумежных падпраграм. Галоўнае патрабаванне да кожнай з падпраграм - укараненне вынікаў навуковых пошукаў у педагагічную практыку, у майстэрства выкладчыкаў.